ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 151 (1420) ПЯТНІЦА, 3 ліпеня 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Кошт асобнага №—2 кап.

ТЭЗІСЫ ЗЬЕЗДУ РЭДАГУЮЦЬ МАСЫ

ПРАЗ ПРАПРАЦОЎКУ ТЭЗІСАЎ КОЖНЫ РАБОЧЫ ТАРПЯНІК—ДЭЛЕГАТ ЗЬЕЗДУ

Да ўсебеларускага зьезду рабсельковаў засталося некальні дзён.

Толькі ў апошнія дні акрэсьліўся значны зрух у распрацоўцы тэзісаў па сэкцыі торпу і энэргетыкі.

Сьледам за рабочымі торпзаводу „Шлях да соцыялізму“ ўносяць свае прапановы рабочыя Міханавіцкага торпзаводу і Белдрэсу. Большасьць гэтых прапаноў зьяўляюцца надзвычайна каштоўнымі і, бязумоўна, будуць прыняты зьездам у сваіх рашэньнях.

Аднак, тэмпы прапрацоўкі тэзісаў ні ў якім разе не могуць нас задаволіць. Яны павінны быць значна павялічаны.

Прыкладу заводаў, прапрацаваўшых тэзісы, павінны пасьледваць усе астатнія торпзаводы.

Да ўсебеларускага зьезду мы павінны прысьці з тэзісамі, прапрацаванымі на ўсіх торпзаводах, з такім разьлікам, каб рапартаваць зьезду, што кожны тарпянік зьяўляецца яго дэлегатам.

УНОСІМ 8 ДАДАТКАЎ

Да апошняга часу з боку партыйнай, комсамольскай і профсаюзнай організацый Міханавіцкага торпзаводу не было зьвернута належнай увагі на прапрацоўку тэзісаў сэкцыі торпу і энэргетыкі—ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

Зараз зроблен пералом. Застаўшыяся да зьезду дні зьяўляюцца ўдарнымі па падрыхтоўцы да яго.

Распрацоўка тэзісаў праходзіць пад лёзунгам—„кожны тарпянік, тарпяніца, тэхнік, дзесятнік, параўшчык, адміністратар — удзельнік рабселькораўскага зьезду“. Уся падрыхтоўка ўвязваецца з барацьбой за выкананьне прамфінпляну.

Абмяркоўваньне тэзісаў яшчэ больш мобілізуе ўсю грамадзкасьць заводу на ліквідацыю маючагася прарыву. Прапрацоўка праходзіць з пункту гледжаньня праламленьня іх у працы Міханавіцкага торпзаводу і тарпяной дасьледчай станцыі.

Шырокая нарада, якая была склікана па пытаньню прапрацоўкі тэзісаў, выказалася за тое, што ў тэзісах з усёй рашучасьцю не завострана ўвага на мэханізацыю торпздабычы і слаба вызначаны шляхі, па якіх павінна ісьці разьвіцьцё торпапрамысловасьці Беларусі. У зьвязку з гэтым нарада вынесла наступныя дадаткі:

1. Ператварэньне Беларусі ў тарпяны Донбас і перавод усёй прамысловасьці да канца пяцігодкі на тарпяны апал патрабуе хутчэйшай мэханізацыі торпапрамысловасьці праз увядзеньне фрэзэрнага, малага і вялікага гідраторпу.

2. Кожны рабселькор, кожны тарпянік павінен змагацца за стандартызацыю машын і інструмантаў у тарпяной прамысловасьці.

У зьвязку з гэтым тарпяная дасьледчая станцыя бярэ на сябе абавязак прапрацаваць пытаньне стандартызацыі інструмантаў для сушкі і ўборкі фрэзэрнага торпу (граблі, савок і насілкі) з мэтай вызначэньня іх памеру і формы.

3. Кожны рабкор-тарпянік павінен змагацца за мэханізацыю кантоўкі і перасоўкі машын.

4. Торпзавод і дасьледчая станцыя бяруць на сябе абавязак практычна прапрацаваць пункт тэзісаў аб увядзеньні новага віду транспорту: драўляных вузкакалеек у торпапрамысловасьці.

5. Кожны рабкор-тарпянік павінен змагацца за паварот навуковадасьледчай працы тарпянога аддзелу, навукова-дасьледчага інстытуту торпапрамысловасьці тварам за вытворчасьці.

6. Рабселькор павінен стаць змагаром за выкананьне прамфінпляну саматужнай торпздабычы (Белсампрамсаюзаў). На гэты участак зьвернута надзвычайна мала ўвагі друку, а ён займае значнае месца ў тарпяной прамысловасьці БССР.

7. Торпзавод бярэ на сябе абавязак практычна прадаміць высунуты тав. Плашчынскім дадатак к тэзісам аб дэкаднай пабрыгаднай калькуляцыі на торпзаводзе.

8. Рабкор-тарпянік павінен быць культмасавым працаўніком сярод завербаваных брыгад у зімовы час на месцы жыхарства брыгад.

Вось тыя пункты, якія грамадзкасьць Міханавіцкага торпазаводу і дасьледчай тарпяной станцыі лічыць неабходным унесьці ў дадатак да тэзісаў сэкцыі торпу і энэргетыкі

Міх. Плашчынскі.

Белдрэсаўцы прапануюць

Прапрацоўка тэзісаў сэкцыі торпу і энэргэтыкі на Белдрэсе імя Сталіна праходзіла на агульным сходзе рабочых, служачых і ІТР.

Было ўнесена шэраг прапаноў, галоўнымі з якіх вось якія:

—Сэкцыя торпу павінна ўзьняць пытаньне на зьезьдзе рабселькораў аб неабходнасьці прыстасаваньня аднаго мэталюргічнага заводу да пераабсталяваньня топак для скарыстаньня фрэзэрнага торпу.

Неабходна паставіць трансформатары, якія заменяць жалезныя правады меднымі.

Астатнія прапановы як-то: забесьпячэньне рабочых вадою, палепшаньне грамадзкага харчаваньня, зборка торпамашыны ў тыдзёвы тэрмін, набыцьцё шабелевачнай машыны датычацца мясцовай працы.

У.

Узмацніць тэмпы падрыхтоўкі да пленуму

Пленум ЦК ЛКСМБ пачне сваю работу 16-га ліпеня.

Падрыхтоўка да пленуму разгарнулася месяц таму назад і ўсё-ж, ня гледзячы на такі працяжны пэрыод, належных тэмпаў, належнага размаху ў організацыях не адчуваецца.

Вельмі многія камітэты па вопыту Менска, Віцебска, Гомелю, вызначылі шырокія програмы падрыхтоўчай дзейнасьці, але вельмі нямногія сумелі разгарнуць належную падрыхтоўку і ўцягнуць усю масу комсамольцаў ў абгаварэньне пытаньняў, стаячых на пленуме.

І калі, параўнаўча, ня дрэнна комсамольскімі організацыямі вядзецца падрыхтоўка да пленуму па росту, дык зусім нездавальняюча па нацкультбудаўніцтву і зусім дрэнна па торпу.

У якасьці конкрэтных задач на далейшы пэрыод падрыхтоўкі, перад усімі комсамольскімі ячэйкамі мы высоўваем наступныя прапановы.

Па нацкультбудаўніцтву пункт за пунктам праверыць рэалізацыю рашэньняў X-га зьезду ЛКСМБ.

„Комсамольскія організацыі павінны стаць на чале кантролю ступені беларусізацыі савецкага і дзяржаўнага апарату, павінны ўзяць ініцыятыву па вывучэньню беларускай мовы рабочымі і рабочай моладзі, організаваўшы шырокую сетку курсаў і школ па вывучэньню белмовы, а таксама разгарнуць шырокую работу па вывучэньню нацыянальнай палітыкі партыі і ўключыць у сыстэму комсамольскай асьветы вывучэньне гісторыі і экономікі БССР.“

Гэты пункт рэзолюцыі X-га зьезду набывае асаблівую актуальнасьць у сувязі з абвешчаным ЦК КП(б)Б месячнікам праверкі беларусізацыі.

Разам з гэтым, зьезд запатрабаваў ад комсамольскіх організацый Беларусі ўдзяліць асаблівую ўвагу і разгарнуць шырокую работу сярод моладзі працоўных нацменшасьцяй.

Зьезд прапанаваў „дабіцца пералома ў рабоце ўсіх організацый, правядзеньні ўсеагульнага абавязковага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці“. „Павінна быць разгорнута вялікая работа па стварэньню і выхаваньню з рабоча-батрацкай моладзі новых кадраў інтэлігенцыі“. „Неабходна дабіцца большай увагі комсамолу і ўсёй пролетарскай грамадзкасьці да тэмаўскага руху“.

У найкарацейшы тэрмін трэба да пленуму прыйсьці з практычнымі данымі, што выканана, што нявыканана, чаму ня выканана, і што робіцца каб настаўленыя задачы зьездам выканаць.

Пры абгаварэньні пытаньняў торпу, пленум запатрабуе ад кожнага сэкратара райкому—ўдзельніка пленума расказаць, што канкрэтна зроблена і робіцца комсамольскімі ячэйкамі для ліквідацыі прарыву на торпраспрацоўках, колькі мобілізавана комсамольцаў на торпзаводы, ці поўнасьцю выканана разьвёрстка ЦК, як комсамольскія організацыі ўдзельнічаюць у выкананьні прамфінпляну і разгортваньне культработы, як кожны комсамолец б'ецца за рэалізацыю лёзунгу „Беларусь павінна стаць тарпяным Донбасам“.

Пленум суміруе ўвесь вопыт бальшавіцкай барацьбы за торп для перадачы яго ўсім організацыям.

* * *

Аддаючы асаблівую ўвагу далейшай падрыхтоўцы да пленуму пытаньням торпу і нацкультбудаўніцтву, райкомы і ячэйкі ў той жа час не павінны паслабляць работы па пытаньнях росту, васеньнясеўнай і ўборачнай кампаніі.

Выконваем соцдагавор з Украінай

УДАРНАЙ РАБОЦЕ—УДАРНЫ АПАРАТ

Забясьпечыць рэалізацыю пазыкі 3-га, рашаючага ў вёсцы гнуткім опэрацыйным ударным ашчадапаратам

Хваля рэалізацыі пазыкі перакінулася ў вясковыя раёны Савецкай Беларусі. Па раду месц гэта работа разгарнулася раней вызначанага тэрміну дзякуючы творчаму ўздыму працоўных мас вёскі.

Неабходна хутчэй рэалізаваць пазыку. Комсамольская організацыя павінна ўстанавіць кантроль за ашчадапаратам, уліць туды новыя кадры з тым, каб забясьпечыць яго баявую бесьперапынную работу.

Прыклад Заслаўскай комсамоліі ў рэалізацыі пазыкі павінен быць перакінуты ўсім раёнам Савецкай Беларусі.

Энэргічна ўключыліся ў работу

Заслаўскі райком комсамолу ўзяў на сябе абавязак рэалізаваць пазыму „3-ці рашаючы“, вызначыўшы сабраць толькі сярод аднаасобнікаў на суму 25 тысяч рублёў. Гэта ускладае на абавязак кожнага комсамольца распаўсюдзіць абліґацыі ня менш, як на 50 рублёў.

Раённы камітэт організаваў 20 брыгад па пасылцы на вёску. Комсамольцы падпісваюцца на месячны заработак і больш.

РК павінен замацаваць узятыя тэмпы з тым, каб вышэй прасунуць пазыку у масы працоўнага насельніцтва і як мага хутчэй рэалізаваць яе.

Ян. Прыбытак.

Газэтам „Чырвоная Зьмена“ і „Рабочий“

На 2325 р, або 110,7 проц. месячнага заработку падпісалася комсамольская ячэйка сумесна з беспартыйнай моладзьдзю Абкомтрэсту.

Сэкратар ячэйкі КСМ Круткоўіч.

Канчаем з посьпехам

Студэнты Горацкага рабфаку імя Галадзеда правялі падпіску на пазыку 3-га рашаючага.

Усе студэнты групы „Д“ падпісаліся на 125 проц. месячнай пэнсіі, а асобныя на 250 проц.

Студэнты і курсанты Бобчынскага пэдтэхнікуму (Хойніцкі раён) падпісаліся на пазыку на 100 проц. месячнай стыпэндыі.

Сідарок і Адачэнка.

Абмежаваліся абгаварэньнем

Гарадзішчанская ячэйка ЛКСМБ нічога не зрабіла для рэалізацыі пазыкі, абмежаваўшыся тым, што гэта пытаньне адзін раз абгаварылі на сходзе.

Пікноўскі РК ЛКСМБ павінен падштурхнуць работу ячэйкі і прыняць рашучыя захады да тых, хто ня хоча праводзіць важнейшыя рашэньні партыі і ўраду.

Карбус.

Ашчадкаса адстае

Ашчадкаса пры Бобчынскім пэдтэхнікуме (Хойніцкі раён) працуе нездавальняюча За адзін квартал плян мобілізацыі сродкаў выкананы толькі на 48 проц. Ніякай працы сярод насельніцтва не праведзена

Комсамольская ячэйка пэдтэхнікуму не дапамагае у гэтай рабоце. Вылучаныя брыгады па вярбоўцы ўкладчыкаў сярод насельніцтва нічога не зрабілі. Толькі адзін раз на агульным сходзе колектыву заслухоўвалі справаздачу ашчадкасы. Гэта сьведчыць аб той незацікаўленасьці, якая ёсьць да гэтай справы.

А. Данчэнка.


Да мас не давялі

Падпіска на пазыку па Дудзінскаму сельсавету (Мазырскі раён) ідзе нездавальняюча. Сельсавет, партыйная і комсамольская ячэйкі не ўдзялілі патрэбнай увагі гэтай рабоце. Задача рэалізацыі пазыкі не даведзена да шырокіх мас працоўнага сялянства.

Неабходна дабіцца пералому ў разгортваньні гэтай работы.

Кіхіліч Р.

ТРЫМАЙЦЕ ТЭМП!



29-га чэрвеня дало вялікае павышэньне здабычы торпу ў параўнаньні з мінулым днём. Усяго здабыта за гэты дзень 3488,1 тон торпу, што складае 42,5 проц. сутачнага заданьня. Такім чынам сэзонны плян выкананы на 12,4 проц. Да гэтага дню здабыта 109177,4 тон торпу, што складае 33,1 каляндарнага пляну.

ПРЫКАВАЦЬ УВАГУ УСЁЙ ПРОЛЕТАРСКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ ДА ЗЬЛЁТУ ТРЭЦЯГА ПАКАЛЕНЬНЯ

Лагойскі, Смалявіцкі і Тураўскі РК ЛКСМБ не ўзялі належных тэмпаў у падрыхтоўцы да зьлёту

Цэнтральны камітэт ЛКСМБ, праверыўшы падрыхтоўку Лагойскага, Тураўскага, Смалявіцкага РК ЛКСМБ да другога ўсебеларускага зьлёту павінен быў канстатаваць, што „тэмпы падрыхтоўчай работы зьяўляюцца нездавальняючымі“.

Такое становішча маецца па цэламу шэрагу іншых раённых організацый Беларусі.

Сэкратарыят ЦК ЛКСМБ у сваёй пастанове яшчэ раз паказвае раённым камітэтам комсамолу, што патрэбна ім зрабіць у час падрыхтоўчай работы да другога зьлёту. Гэтыя паказаньні ЦК ЛКСМБ павінны быць выкананы.

Раённым і цэнтральным газэтам неабходна таксама ўключыцца ў асьвятленьне падрыхтоўчай работы піонэрорганізацыі да зьлёту.

Да другога ўсебеларускага зьлёту застаўся зусім кароткі час. Яго патрэбна максымальна выкарыстаць з тым, каб прыйсьці да зьлёту са значным зрухам у рабоце піонэрорганізацыі.

ПАСТАНОВА

сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ ад 23—VI-31 г. аб ходзе падрыхтоўкі да 2-га ўсебеларускага зьлёту піонэраў

1. Заслухаўшы даклады Лагойскага, Тураўскага, Смалявіцкага РК ЛКСМБ аб ходзе падрыхтоўкі да 2-га ўсебеларускага зьлёту, сэкратарыят ЦК ЛКСМБ адзначае, што тэмп падрыхтоўчай работы зьяўляецца нездавальняючым, асабліва ў Смалявіцкім і Лагойскіх раёнах. Райкамолы, ня гледзячы на дырэктывы ЦК аб стварэньні грамадзкасьці і карэннага палепшаньня комсамольскага кіраўніцтва працай піонэр. організацыі, за час падрыхтоўчай работы не дабіліся патрэбнага зруху ў выкананьні пастаноў ЦК. Прызнаючы нездавальючай падрыхтоўку да зьлёту, сэкратарыят ЦК пастанаўляе:

2. Прапанаваць РК ЛКСМБ скарыстаць застаўшыся час да 2-га ўсебел. зьлёту для сапраўды бальшавіцкай падрыхтоўкі і мобілізацыі комсамольскай організацыі, а таксама пролетарскай грамадзкасьці навакол правядзеньня ўсебеларускага зьлёту. ЦК абавязвае РК дабіцца выкананьня пастаноў X зьезду ЛКСМБ аб карэнным палепшаньні комсамольскага кіраўніцтва, асабліва з боку ячэек ЛКСМБ працай піонэр. атрадаў. РК ЛКСМБ прыняць неабходныя меры палепшаньня якаснага складу піонэркадраў, вылучыўшы для гэтай работы лепшых комсамольцаў-актывістых, здольных правільна ажыцьцяўляць лінію ЛКСМБ па камуністычнаму выхаваньню мас працоўнай дзетвары. ЦК папярэджвае, што правядзеньне ўсебеларускага зьлёту зьяўляецца важнейшай палітычнай задачай у сучаснай рабоце комсамолу ў Беларусі.

3. Адзначаючы нездавальняючую работу піонэр. орг-цыі па ўдзелу ў колектывізацыі сельскае гаспадаркі, прапанаваць РК ЛКСМБ мобілізаваць піонэр. орг-цыю і працоўную дзетвару на сапраўдную барацьбу за колгаснае будаўніцтва, за выкананьне ўзятых абавязацельстваў па дагавору з НКЗ, праверку ўдзелу ў ажыцьцяўленьні задач партыі па нац. культ. будаўніцтву. Навакол гэтых задач неабходна згрупаваць усю ўвагу і ініцыятыву піонэр. організацыі з тым, каб да ўсебелар. скага зьлёту дабіцца завяршэньня павароту да задач соц. будаўніцтва. ЦК зварочвае ўвагу ўсіх камітэтаў ЛКСМБ на неабходнасьць шырокага прыцягненьня пролетарскай грамадзкасьці да практычнай дапамогі піонэр. організацыі ў яе штодзённай рабоце, у падрыхтоўцы да 2-га ўсебеларускага зьлёту піонэраў.

Неабходна праверыць выкананьне тых абавязацельстваў—якія былі ўзяты з боку грамадзкіх організацый ў час 1-га ўсебелар. зьлёту піонэраў. РК у адпаведнасьці з гэтым організаваць масавую праверку, прыцягнуўшы да гэтай работы колгасьнікаў, ударнікаў МТС, „ЛК“ і вынікі праверкі абгаварыць на раённым піонэрскім зьлёце.

4. Прызначаючы зусім нездавальняючым выкананьне пастаноў X-га Зьезду ЛКСМБ аб 100 проц. ахопе дзяцей колгасьнікаў, беднякоў, батракоў піонэр. організацый, прапанаваць РК і ячэйкам ЛКСМБ безадкладна разгарнуць масавую работу сярод неорганізаваных дзяцей, правёўшы масавую вярбоўку ў рады піонэр. організацыі дзяцей-колгасьнікаў, беднякоў, батракоў, дабіўшыся ў бліжэйшы час выкананьня пастаноў IX і X зьездаў комсамолу аб росьце піонэр. організацый.

ЦК зварочвае ўвагу на неабходнасьць штодзённай работы па росту піонэр. організацыі, зьвязваючы гэта з шырокім штодзённым уцягненьнем дзяцей ў ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў партыі па колгаснаму будаўніцтву.

5. Адзначаючы зусім нездавальняючае асьвятленьне ходу падрыхтоўкі да ўсебеларускага зьлёту на старонках цэнтральных і раённых газэт, прасіць Культпроп ЦК КП(б)Б у адпаведнасьці з пастановай ЦК КП(б)Б забясьпечыць неабходнае асьвятленьне падрыхтоўкі да ўсебеларускага зьлёту на старонках друку. Абавязаць рэдакцыю „Ч. З.“ сыстэматычна асьвятляць ход падрыхтоўкі да зьлёту, праверыўшы асобныя раёны, як апошнія выконваюць пастанову Бюро ЦК аб падрыхтоўцы да зьлёту.

За становішча піонэрорганізацыі адказвае комсамол

Бягомльскі райком комсамолу недаацэньвае ролі дзіцячага піонэрскага руху

На працягу 7-мі месяцаў зьмяніліся тры райпіонэрработнікі, а піонэрработа як была ў заняпадзе, так і засталася.

У райкоме няма вучоту, невядома колькі налічваецца піонэраў у раёне, як працуюць атрады, як імі кіруюць комсамольскія ячэйкі і як піонэрамі выконваюцца дагаворы з Наркамзямам, ВСНГ і колгасцэнтрам.

У раёне яшчэ як-небудзь працуе 3 атрады пры колгасах „Гэрой працы“, „Усход“ і „М. Горкі“. І то работа гэтых атрадаў не пераключана на штодзённую работу ў саўгасах, колгасах, на разгортваньне там соцыялістычнага спаборніцтва і г. д.

Астатнія піонэратрады знаходзяцца ў стане поўнага развалу. Піонэрыя раёну ня ведае, што набліжаецца другі Усебеларускі піонэрскі зьлёт і як да яго трэба рыхтавацца.

За апошні час наглядаецца масавы адсеў з піонэратрадаў у зьвязку з тым, што няма выхаваўчай працы, адсутнічае кіраўніцтва з боку ДКО РК ЛКСМБ і комсамольскіх ячэек.

Юнкор.

Выканаць узятыя абавязкі

На VI-м раённым Зьезьдзе Саветаў Лёзьненскага раёну быў прыняты наказ ад піонэрорганізацыі Лёзны. Наказ ахапіў усе гаспадарча-палітычныя пытаньні і быў прыняты без усякіх зьмен зьездам.



Піонэры абавязаліся прыняць актыўны ўдзел у вясеньня-пасяўной кампаніі і ў колгасным будаўніцтве. Савецкія і гаспадарчыя органы павінны былі ўсіх піонэраў за весеньне-летні час прапусьціць праз лягеры, а таксама павінны былі пабудаваць дзіцячую тэхнічную станцыю.

Піонэрорганізацыя свае абавязкі выконвае. Піонэры Лёзны усю вясну працавалі на колгасных палёх. Лёзьненскім беларускім і яўрэйскім піонэратрадам адпраўлена ў колгасы каля 3 тысяч працадзён. Піонэры сваіх бацькоў агітуюць за колгасы. Піонэратрадамі і школамі організавана 4 колгасы.

Але гаспадарчыя і савецкія ўстановы ўзятыя на сябе абавязкі не выконваюць. Лягеры не організаваны. Пабудова дзіцячай тэхнічнай станцыі таксама затрымліваецца, не гледзячы на тое, што ў бюджэту вызначана на гэта 4 тысячы рублёў. Пабудова гэтай станцыі затрымліваецца тым, што далі дом, які патрабуе рамонту на 3 тысячы рублёў. Гэты дом стаіць за 1 з пал. кілёметры ад цэнтру мястэчка, далёка таксама ад колгасу і школы МТС, у той час як у наказе было ўказана аб тым, каб дзіцячая тэхнічная станцыя будавалася пры саўгасе, альбо колгасе, ці МТС.

Адпаведныя організацыі павінны зацікавіцца працай дзяцей і дапамагчы ім.

Брыгада „Ч. З.“ Кузоўскі і Кулакоў

УСІМ ОРГАНІЗАЦЫЯМ ЛКСМБ

Кантрольны пленум ЦК ЛКСМБ склікаецца 16-га ліпеня б. г. з наступнай абвесткай дня:

1) *Аб выкананьні рашэньняў Х-га Зьездзу ЛКСМБ і IX Зьезу УсеЛКСМ аб ператварэньні комсамола ў шматмільённую організацыю (т. Гуткін)*

2) *Аб выкананьні рашэньняў Зьездаў комсамолу па ўдзелу ЛКСМБ у нац. культ. будаўніцтве (дакл. т. Рубічык).*

3) *Даклад Белторпабʼяднаньня і праверка выкананьня дырэктыў па ўдзелу ЛКСМБ у вырашэньні тарпяной праблемы (дакладчыкі—прадст. Белторпабʼяднаньня і т. Шаўцоў).*

4) *Вынікі ўдзелу ЛКСМБ у вясеньняй пасеўнай кампаніі, аб уборачнай кампаніі і асеньняй сяўбовай кампаніі (прадст. НКЗ і тав. Сапега).*

На пленум, акрамя членаў і кандыдатаў ЦК ЛКСМБ, выклікаюцца ўсе сакратары райкомаў ЛКСМБ

Сакратар ЦК ЛКСМБ ГУТКІН.

Да кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ

ПОЎНАСЬЦЮ АЖЫЦЬЦЯВІЦЬ ПРОГРАМЫ БАЯВЫХ ДЗЕЯНЬНЯЎ

Падцягнуць адстаючыя вучасткі

Комсамольскія організацыі Бабруйску шырока разгарнулі работу па падрыхтоўцы да кантрольнага пленуму.

На машынабудаўнічым заводзе ў час праведзеньня зьлёту рабочай моладзі паступіла 73 заявы аб уступленьні ў шэрагі ленінскага комсамолу. У механічным цэху створана скразная ударная брыгада з моладзі і 2 комсамольскія брыгады ў астатніх цэхах. Да дню зьлёту сабрана 50 рабочых прапаноў рацыяналізатарскага і плянаваправацыйнага характару.

Колектыў КСМ комбінату, разгортваючы працу па падрыхтоўцы к кантрольнаму пленуму, дабіўся значнага росту комсамольскай організацыі. За апошнія дні ў колектыў паступіла звыш 100 заяў аб уступленьні ў шэрагі комсамолу. Комсамольская організацыя комбінату ўключылася ў штурм па ліквідацыі прарываў у выкананьні прамфіняну на комбінаце.

На вясковай організацыі разгорнута праца па організацыі новых колгасных ячэек.

У апошнія дні організавана колгасная ячэйка ў Прадвільскім сельсавеце, дзе да апошняга часу не было ніводнага комсамольца. Організаваны новыя колгасныя ячэйкі ў Лешчанскім, Мышкаўскім, Мальлеўскім, Баравіцкім, Харлапавіцкім сельсаветах. Організаваны ячэйкі на торпзаводзе „Новая Беларусь“ і ў саўгасе імя Леніна ў Сычкаўскім сельсавеце.

Райком мяркуе ў пачатку ліпеня месяца організаваць 2-хтыднёвыя курсы організатараў колгасных ячэек і пропагандысцкіх ліквідатараў палітнясьпісьменнасьці вясковага комсамолу, разьлічаных на 30—40 чалавек. Пачата ўжо падрыхтоўчая праца па організацыі гэтых курсаў.

Аднак, патрэбна адзначыць, што ў справе падрыхтоўкі да кантрольнага пленуму ў Бабруйскай організацыі маецца шэраг недахопаў па некаторых важнейшых пытаньнях: вайсковая вучоба, аўладаньне тэхнікай вытворчасьці, пытаньне цалкам ходу за ўлік працы ў колгасах і шэраг інш.

Праца вайсковых комсамольскіх пунктаў за апошні час зусім паслабла. Райсавет Асо ня прымае ніякіх захадаў да забясьпячэньня пунктаў вайсковымі кіраўнікамі. Бюро колектываў і ячэек ня прымаюць меры да тых комсамольцаў, якія не наведваюць вайсковыя пункты і нагул зрываюць вайсковую вучобу.

У пунктах слаба наладжана справа па вывучэньню вайсковатэхнічнай справы.

Комсамольскі паход за аўладаньне тэхнікай на стаў яшчэ масавым паходам. За выключэньнем асобных цэхаў комбінату, ніздзе тэх. вучобай не займаюцца.

Неабходна да кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ падцягнуць адсталыя галіны працы і ўзяцца як сьлед за ліквідацыю тых прарываў, якія яшчэ маюцца ў Бабруйскай організацыі ЛКСМБ.

Юнкор „Ч. З.“ Хазанаў.

Пасьледуйце нашаму прыкладу

Мы, маладыя ударнікі, падлеткі швэйна-штопальнага цэху панчошнай фабрыкі ў лік 91 асоб, уразумеўшы важнасьць рашэньняў 9-га зьезду аб ператварэньні комсамолу у шматмільённую організацыю, уступаем у шэрагі ленінскага комсамолу.

Будзем актыўнымі ўдзельнікамі ў справе выкананьня прамфінпляну соцыялістычнага будаўніцтва.

Уступаючы ў шэрагі ЛКСМБ, мы заклікаем усю астатнюю беспартыйную рабочую моладзь пасьледваць нашаму прыкладу..

91 подпіс.

Перавыбары ня былі ўвязаны з ростам

Комсамольскі колектыў швэйнай фабрыкі „Профінтэрн“ (Віцебск) не разгарнуў ніякай работы па падрыхтоўцы да кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ. З 320 чалавек рабочае моладзі комсамольцаў толькі 195 чалавек. За першую палову чэрвеня колектыў вырас на 15 чал.

Перавыбары бюро колектыву цэхавых ячэек ня былі ўвязаны з барацьбой за 100 проц. рабочае моладзі ў комсамол.

Слабыя тэмпы росту колектыву тлумачыцца адсутнасьцю разгорнутай масавай работы сярод рабочае моладзі.

Брыгадзір „Чырвонай Зьмены“ Сэгаль.

Зрабіць Менскі будвуч комсамольскім

Рашэньне IX зьезду УсеЛКСМ аб пагалоўным ахопе фабзайцаў комсамолам, комсамольскай ячэйкай будвучу Белжылсаюзу не падхоплена. З 140 чал. вучняў толькі 30 комсамольцаў. Адсутнічае работа па ўцягненьню будвучаўцаў у комсамол. Перавыбары бюро ячэйкі не былі ўвязаны з ростам.

Так не павінна быць. Будвуч павінен стаць у бліжэйшы час комсамольскім.

Брыгадзір „Ч. З.“ Міхалевіч.

На Прапойшчыне яшчэ ня думаюць аб політмінімуме

ПРАПОЙСК.

Ня гледзячы на тое, што шасьцімесячнік ліквідацыі політняпісьменасьці вясковага комсамолу ў цэлым радзе раёнаў пачаўся у Прапойскім р-не аб ім і ня думаюць. Большасьць ячэек ніякай падрыхтоўчай работы да політмінімуму не правяла і не праводзіць. РК ЛКСМБ ня прымае ніякіх захадаў да тых ячэек, якія зрываюць заняткі.

Вольны

Ачысьціць ячэйку ад кулакоў

У Халодніцкую ячэйку ЛКСМБ Мазырскага р-ну, пралезла шмат кулакоў, якія плоцяць больш 100 р. падатку. Напрыклад, Байкоў Павел, бацька якога плоціць 105 р. сельгаспадатку.

Засьмечанасьць ячэйкі заможнікамі тлумачыцца тым, што сэкратар ячэйкі Лвонаў, які таксама зьяўляецца заможнікам, не дае правільных зьвестак у райком аб соцыяльным становішчы паступаючых.

Колгасьнікам і батракам бюро ячэйкі адмаўляе ў прыёме ў комсамол.

У часе перавыбараў бюро, ячэйка павінна аслабаніцца ад клясава-варожых элемэнтаў, якія пралезьлі ў комсамол.

Кветка і Прышчэпка.

9-ты дзень комсамольскага паходу

УДАРНАЙ СУСТРЭЧАЙ УБОРАЧНАЙ— МАЦАВАЦЬ ПОСЬПЕХ СЯУБЫ

КОМСАМОЛ ПОЛАЧЧЫНЫ ПАКАЗАЎ БАЛЬШАВІЦКІЯ ВУЗОРЫ БАРАЦЬБЫ ЗА ОРГАНІЗАЦЫЮ ПРАЦЫ Ў КОЛГАСАХ

Ударнымі тэмпамі разгарнулася касьба

МАГІЛЕЎ. У раёне разгарнулася масавая касьба канюшыны. Колгас „Комінтэрн" Слабацкога сельсавету скончыў касьбу канюшыны 18-га чэрвеня, выканаўшы плян касьбы ў тры, дні замест 5-ці.

Дзякуючы зьдзельшчыне з улікам працадзён па колькасьці і якасьці работы кожнага колгасьніка, колгас „Першага Мая" скончыў касьбу канюшыны раней тэрміну.

Шырока разгарнулася касьба ў колгасах Вендароўскага сельсавету.

БЕЛТА.



Зьняць працоўную кніжку з паліцы

У колгасе „Кастрычнік" (Хойніцкі раён) працоўныя кніжкі не даведзены да колгасьнікаў. Праўленьне колгасу, атрымаўшы кніжкі, паклала іх на паліцы.

Колгас формальна пераведзен на зьдзельшчыну. Колгасьнікі ня ведаюць, як імі выконваюцца нормы выпрацоўкі. Не праводзіцца ўлік работы і запіс у працоўныя кніжкі, а гэта ўносіць вялікую перашкоду ў працы колгасу. З-за таго, што колгасьнікі ня ведаюць колькі імі выпрацавана працадзён, паніжаецца продукцыйнасьць працы.

Комсамольская ячэйка да гэтага часу ня выступіла ў паход за правільны ўлік працадзён у колгасе.

Брыгада Падарожны і Лясны.

Вывесьці раён з глыбокага тылу

На Заслаўшчыне падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі ідзе слаба. Плян уборкі яшчэ ня спушчаны ў сельсаветы. Колгасы пачалі касьбу, а райколгассаюз толькі гэтымі днямі пачаў рассылку па колгасах плянаў. Па большасьці колгасаў няма дакладных плянаў разьмеркаваньня і правядзеньня ўборачных работ. На сходах колгасьнікаў не абгавораны пляны ўборачнай кампаніі, нормы выпрацоўкі. Большасьць работ уборачнай кампаніі не пераведзена на зьдзельшчыну, не організаваны брыгады для выкананьня асобных работ па ўборцы, соцспаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнута.

Сельска-гаспадарчы інвэнтар не рамантуецца. Па колгасах трэба адрамантаваць дзьве касілкі, 10 жняярак самаскідак, 70 малатарань, 10 конных прыводаў і іншы сельска-гаспадарчы інвэнтар. Але ні райколгассаюз, ні колгасы ня прынялі энэргічных мер, каб сваячасова скончыць рамонт.

У колгасах не хапае сельска-гаспадарчых уборачных машын. 8 штук конных грабель, 14 сенакасілак, 9 трактарных малатарань палускладных і 5 штук складных, але раённае кіраўніцтва ня прымае належных мер, каб сваячасова атрымаць гэтыя машыны.

У час вясеньняй сяўбы большасьць колгасаў зусім не вяла ўліку працадзён па колькасьці і якасьці выпрацоўкі норм. У выніку рад колгасаў адсталі па сяўбе. Аднак, і зараз па вестках, якія маюцца ў раёне, з 38 колгасаў толькі 20 формальна пераведзены на зьдзельшчыну штодзённага ўліку працадзён няма.

Комсамольская організацыя ня ўключылася ў паход, абвешчаны ЦК ЛКСМБ, ячэйкі не праводзяць ніякай работы, каб дапамагчы колгасам і партячэйкам выканаць дырэктыву Чэрвеньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб поўным скончэньні ва ўсіх колгасах наладжваньня ўліку працадзён кожнага колгасьніка да пачатку ўборкі. У раёне атрыманы працоўныя кніжкі, але да колгасьнікаў яны не даведзены.

Комсамол Заслаўшчыны павінен тэрмінова, па-баявому, па-комсамольску мобілізавацца і выступіць у паход за правільны ўлік працы ў колгасах, за ўдарную падрыхтоўку да ўборкі бальшавіцкага ўраджаю.

Прыбытак.

Прыцягнуць да партыйнай адказнасьці кіраўнікоў Аршанскага райкамолу

У Аршанскім раёне комсамольскі паход за правільны ўлік працадзён у колгасах фактычна ня пачаўся.

Раней райкомам было накіравана ў сельсаветы 12 комсамольцаў-брыгадзіраў для падліку працы ў колгасах і на гэтым уся работа скончылася. Райкомаўцы лічаць, што ўсё тое, што патрэбна было, яны зрабілі.

У раёне 143 колгасы, з іх 112 не забясьпечаны працоўнымі кніжкамі. 41 колгас яшчэ не пераведзены на зьдзельшчыну. 27 колгасаў ня маюць рахункаводаў.

У Колгасах Машкоўскага сельсавету кніжок зусім няма, улік не пачаўся. У колгасах Вера-Вайжанскага сельсавету працоўныя кніжкі атрыманы, але колгасьнікам ня ўручаюць, бо зьдзельшчыны як таковай ня было і праца ня ўлічваецца. У колгасе імя 6-га зьезду Саветаў працуюць мэтадам падзёншчыны.

Накіраваныя 12 комсамольцаў ніякай конкрэтнай работы ня робяць, колгасныя комсамольскія ячэйкі не мобілізаваліся для правядзеньне паходу за ўлік працы. Дырэктыва ЦК аб мобілізацыі двух комсамольцаў на колгас ня выканана.

Паход сарваны. Райкомаўцы заяўляюць, што „мы ня можам мобілізаваць комсамольцаў з разьлікам два чалавекі на колгас,—комсамольцаў няма(?), а з вытворчасьці зьнімаць ня будзем". Сакратар райкому Лапіцкі і яго намесьнік Вайтовіч ня здолелі ацаніць вялікай політычнай важнасьці абвешчанага комсамолам паходу і ня ўжылі ніякіх конкрэтных захадаў, каб мобілізаваць увагу ўсёй комсамольскай організацыі, прыцягнуць да конкрэтнай работы па ўліку комсамольцаў-колгасьнікаў.

Уся работа па паходу застаўлена на самацёк. Дырэктыва ЦК ня выконваецца. Кіраўнікі Аршанскага райкому павінны быць прыцягнуты да партыйнай адказнасьці.

А. Усьмінскі

Полацкі комсамол--прыклад усяму ЛКСМБ

З часу ўключэньня ў комсамольскі паход за правільны ўлік працадзён у колгасах, Палацкая раённая комсамольская організацыя дабілася вялікіх посьпехаў. Ужо зараз напярэдадні выніку работы мобілізаваных комсамольцаў і ўсёй комсамольскай організацыі па ажыцьцяўленьню баявых задач паходу даюць добры малюнак.

97 брыгадзіраў комсамольцаў, правільна ўсьвядоміўшы свае заданьне, аказалі колгасам практычную дапамогу не толькі ў наладжваньні ўліку з тэхнічнага боку, але дапамаглі практычна перавесьці ўсю работу колгасаў на зьдзельшчыну, з дакладным улікам колькасьці і якасьці работы, разгарнуць соцспаборніцтва і ўдарніцтва сярод колгасьнікаў, а таксама організавалі ўдарныя маладзёжныя брыгады.

На 30-е чэрвеня комсамольцамі абслужана 30 колгасаў у якіх да кожнага колгасьніка даведзена працоўная кніжка з дакладным улікам выпрацаваных працадзён за час вясенняй сяўбы і прапалачнай кампаніі.

У большасьці гэтых колгасаў зьдзельшчына была ўведзена формальна. Разьліковыя кніжкі меліся, але яны ня былі даведзены да кожнага колгасьніка і ніхто іх не запаўняў. Вучот працы вёўся старым мэтадам па колькасьці дзён (палкі), а не па колькасьці і якасьці выпрацаваных працадзён. З прыездам комсамольцаў гэтыя прарывы ў асноўным ліквідаваны. Разьліковая кніжка даведзена больш чым да 5 тысяч колгасьнікаў. Ва ўсіх колгасах абгавораны і замацаваны нормы зьдзельшчыны.

У колгасе імя Сталіна, прыкладна, вучот працы праводзіцца наступным чынам: брыгадзір пасьля сканчэньня дзеннай працы вымярае плошчу і вядзе ўлік работы, адзначаючы кожнаму колгасьніку колькасьць і якасьць зробленай работы; потым на падставе гэтых запісаў вылічвае працадні, выходзячы з нормы зьдзельшчыны, якая ўстаноўлена ў колгасе для цяжкай, сярэдняй, лёгкай і кваліфікаванай работы. Кожную цыдзёнку брыгадзір работы колгасьніка запісвае ў яго працоўную кніжку.

Комсамольская брыгада ў колгасе „Шлях Ільліча" разам з праўленьнем колгасу распрацавала нарад і памятку--наказ, што палягчае для брыгадзіраў вядзеньне вучоту працадзён.

Праведзена вялікая работа па організацыі працы моладзі. У радзе колгасаў організаваны маладзёжныя ўдарныя брыгады, паміж якімі заключаны дагаворы на соцспаборніцтва па лепшае выкананьне вытворчых плянаў колгасу. У колгасе „Шлях Леніна" комсамольцы дабіліся таго, каб кожную пяцідзёнку праўленьне на спэцыяльнай дошцы вывешвала зьвесткі пра ход работы ў колгасе і конкрэтныя паказчыкі ажыцьцяўленьня зьдзельшчыны.

Усе гэтыя мерапрыемствы комсамольскія брыгады праводзілі пры актыўнейшым удзеле самых колгасьнікаў, брыгадзіраў, рахункаводаў і членаў праўленьня.

Полацкая організацыя дабілася вялікіх посьпехаў у паходзе за правільны ўлік працы, але на гэтым застанаўлівацца нельга. Трэба наладзіць з такім-жа энтузіязмам біцца за комуністычную організацыю працы ў колгасах.

Р. Хазан.
Хадкевіч.

ПАТРАБУЕМ ХУТЧЭЙШАГА РЭАГАВАНЬНЯ НА КОЖНУЮ ЮНКОРАЎСКУЮ ЗАМЕТКУ

Адстаючыя раёны павінны ўзяць ударныя тэмпы падрыхтоўкі да рабселькораўскага зьезду

Вузорная работа

Да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў юнкоры Менскага Хэміка-Тэхналёгічнага тэхнікуму правялі вялікую работу вакол насьценгазэты тэхнікуму „Кузьня пралетарскіх кадраў", якая стала сапраўдным організатарам студэнцкіх мас вакол пытаньняў высунутых партыяй і комсамолам.

Газэта выпусьціла спэцыяльны ліст для завочнікаў-тарнянікаў, у якім бярэ на сябе абавязак трымаць з імі сыстэматычную сувязь. Газэта дабілася ўзмацненьня працоўнае дысцыпліны, як у тэхнікуме, так і па за ім. бярэ слабейшых па вучобе на буксір. рашуча змагаецца з выхадкамі вялікадзяржаўных шовіністых і г. д.

„Кузьня пралетарскіх кадраў" вядзе шырокую масавую работу сярод студэнтаў. Прыкладам гэтага можа служыць тое, што 60 студэнтаў зьяўляюцца юнкорамі газэты.

Аднак газэта дагэтуль на дабілася каб адміністрацыя і грамадзкія організацыі тэхнікуму рэагавалі на дапісы, зьмешчаныя ў ёй.

Юнкор „ЧЗ" Зьмітрок Вішнёвы.

Аб надыходзячым зьездзе ніхто ня ведае

У Капаткевіцкім раёне партыйна-комсамольскія організацыі ніякай масавай работы з рабселькорамі не вядуць. Тыя рабкоры, якія маюцца ў раёне працуюць распылена, ня існуе ніводнай рабсельбрыгады. Падрыхтоўка да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў не праводзіцца, дагэтуль яшчэ ніва не прапрацаваны тэзісы да зьезду. Райком КП(б)Б пяць разоў склікаў раённыя зьлёты рабселькораў, але яны зрываліся, дзякуючы таму, што ня было праведзена адпаведнай падрыхтоўчай работы. У выніку атрымоўвалася, што на іх ніхто акрамя некаторых вучняў сямігодкі не зьяўляўся.

Трэба зараз-жа зрабіць карэнны пералом ў гэтай рабоце.

Маладняк.

Ігнаруюць пастанову ЦК КП(б)Б

У Рудакоўскім сельсавеце (Віцебскі р-н) ня гледзячы на ўсе умовы для выпуску, насьценгазэта да гэтага часу ня выходзіць. Ні партыйная, ні комсамольская ячэйкі гэтага сельсавету ніякай работы з рабселькорамі не праводзяць. Яны відаць, забыліся, што друк зьяўляецца самай моцнай зброяй партыі ў барацьбе за соцыялістычную перабудову вёскі.

Зараз, у зьвязку з надыходзячым рабселькораўскім зьездам, партыйна-комсамольскай організацыі неабходна раскачацца і ўзяцца практычна за правядзеньне ў жыцьцё пастановы ЦК УсеКП(б) аб разгортваньні нізавога друку і кіраўніцтве рабселькоррухам.

Юнкоры Усыскін, Ваўчок.

Дакуль гэтак будзе?

Безадказныя адносіны назіраюцца з боку адміністрацыі Хэміка-тэхналёгічнага тэхнікуму (Менск), а таксама і грамадзкіх організацый да рэагаваньня на юнкораўскія допісы ў насьценгазэце.

На зьмяшчаемыя допісы аб прагульшчыках, супраціўленьні беларусізацыі і іншыя ніхто не зьвяртае ўвагі. Ня дзіва, што сярод некаторых юнкораў маецца думка аб тым, што „няма ахвоты пісаць, бо на допісы усероўна ніхто не рэагуе".

Тое самае назіраецца і з допісамі, зьмешчанымі ў цэнтральным друку. Тыдні тры таму назад у газэце „Чырвоная зьмена" сыгналізавалі аб прарыве ў тэхнікуме на фронце ажыцьцяўленьня ленінскай нацполітыкі. У артыкуле фігуравала студэнтка, якая злосна супраціўляецца беларусізацыі. Але і на гэтыя сыгналы грамадзкія організацыі тэхнікуму не рэагуюць.

Мы пытаемся, дакуль гэтак будзе?

Брыгадзір юнкорбрыгады „Ч. З."
Канончык.

Зьнішчыць недаацэнку нізавога друку

У Маслакоўскім сельсавеце (Копыльскі раён) мала надаецца ўвагі разгортваньню рабселькораўскага руху. Партыйна-комсамольскія ячэйкі слаба кіруюць рабселькорамі. Перавыбары рэдколегій насьценгазэт пры колгасах і сельсавеце праходзяць марудна і безналежнага партыйнага кіраўніцтва.

Агляд насьценгазэт паказаў, што рад колгасаў і саўгасаў сельсаветаў ня маюць насьценгазэт (колгасы „Чырвоны агарод", „Чырвоная фэрма", „Чырвоны кастрычнік" і г. д.) Комсамольскія ячэйкі не змагаюцца за тое, каб наладзіць выпуск насьценгазэт ў гэтых колгасах.

Юнкор „Ч. З." Дзераза.

Насьценгазэта павінна быць сапраўдным барацьбітом за колектывізацыю

Насьценгазэта саўгасу Межава (Аршанскі раён) ня выходзіць ўжо амаль два месяцы і зусім зразумела, што яна адстае ад жыцьця саўгасу, не спраўляецца з задачамі, ўскладзенымі на яе. Комсамольская, партыйная і профсаюзная організацыі не зьвяртаюць увагі на гэтыя зьявішчы. Ніякай працы з рабселькорамі саўгасу не праводзіцца.

Зараз у зьвязку з надыходзячым зьездам рабселькораў партыйна комсамольскай організацыі неабходна як сьлед узяцца за ператварэньне насьценгазэты ў сапраўднага барацьбіта за баявыя тэмпы ў працы саўгасу.

Будаўнік.

„Ад перамены месца сума складнікаў не мяняецца"

На швэйнай фабрыцы „Кастрычнік" (Менск) у сучасны момант выпускаецца 6 цэхавых насьценгазэт і адна шматтыражка.

Сэкратар комсамольскага колектыву опортуністычна недаацэньвае організацыю маладзёжных кутков. Спасылаючыся на об'ектыўныя прычыны, ён упарта адмаўляецца організаваць маладзёжныя куткі пры цэхавых насьценгазэтах. — „У нашых цэхавых насьценгазэтах, хоць мала, але ўсё-ж такі часамі і ёсьць артыкулы аб працы моладзі. Я лічу немэтазгодным організацыю маладзёжнага кутка пры насьценгазэтах. Хопіць таго, што організуем пры шматтыражцы,—гаворыць сэкратар. „Ад пэратасоўкі складнікаў сума не мяняецца. Ці будзе ў нас спэцыяльны куток у насьценгазэтах ці не,—усё роўна нічога асаблівага не атрымаецца,"—гаворыць загадчык культмасавага сэктару фабрыкі.

Аб зацікаўленасьці бюро комсамольскага колектыву кіраўніцтвам і разгортваньнем юнкорруху на фабрыцы гаворыць яшчэ і тое, што ніякай масавай працы з юнкорамі, якіх пры шматтыражцы 25 чал. і 80 пры насьценгазэтах, не праводзіцца.

Брыгада „ЧЗ" Канончык Я.
і Крутаўцоў П.

Ведаць гісторыю і экономіку Беларусі. Аўладаць і штодзённа ўжываць беларускую мову

Матар'ялы, якія зьмяшчаліся раней і зьмяшчаюцца ў сёнешнім нумары, сыгналізуюць аб недастатковай рабоце нізавых комсамольскіх організацый па хутчэйшаму і лепшаму ажыцьцяўленьню дырэктыў ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ у галіне аўладаньня і штодзённага ўжываньня беларускай мовы, вывучэньня гісторыі і экономікі Беларусі.

Шмат якія ячэйкі і нават колектывы, як паказваюць весткі, яшчэ да сёнешняга дня не ўключыліся па-баявому ў месячнік генэральнай праверкі беларусізацыі, яшчэ ня вылучаны праверачныя брыгады, не організаваны гурткі ці брыгады па прыкладнаму вывучэньню і ўжываньню беларускай мовы.

Комсамольскім організацыям, якія яшчэ ня ўключыліся ў месячнік генэральнай праверкі беларусізацыі, трэба зараз-жа па-баявому, уключыцца і выканаць рашэньні ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ у галіне аўладаньня і ўжываньня белмовы.

Мы чакаем ад райкомаў, юнкораў і „лёгкіх кавалерыстых“ вестак аб ходзе генэральнай праверкі беларусізацыі.

Даць палітычна-сьвядомы і пісьменны прызыў

ЦК ЛКСМБ абвясьціў усебеларускі паход за клясава-пісьменны прызыў у РСЧА. З 22 па 25 чэрвеня—першы пераход—вучот няпісьменных і малапісьменных прызыўнікоў, але па сёньнешні дзень райкамолы, колектывы і ячэйкі маўчаць, у тым ліку і галоўныя атрады паходу і не дасылаюць вестак аб становішчы з разгортваньнем работы па рэалізацыі пастановы ЦК ЛКСМБ.

Маўчаньне, асабліва галаўных атрадаў абвешчанага пераходу мы расцэньваем як опортуністычную недаацэнку рэагаваньня на матар'ялы друку, асабліва па такой вялікай палітычнай важнасьці справе, як ліквідацыя няпісьменнасьці сярод дапрызыўнікаў.

Сэкратары гаркамолаў: Гомельскага тав. **Камісарчык**, *Віцебскага—***Назлоў**, *Менскага—***Янковіч** *не праверылі, як ажыцьцяўляюць іх ваеноргі пастанову ЦК ЛКСМБ, як ваеноргі разгортваюць працу па пераходах.*

„Чырвоная Зьмена“ чакае ад усіх райкомаў комсамолу і ў першую чаргу, ад галаўных атрадаў, ад юнкораўскіх брыгад і пастоў, ад лёгкіх кавалерыстых і ударнікаў вестак—матар'ялаў аб тым, як праходзіць у іх раёне, сельсавеце, саўгасе, колгасе і вёсцы работа па разгортваньні паходу за клясава-пісьменны прызыў.

Комсамол Беларусі павінен выканаць узяты абавязак—даць політычна пісьменнае папаўненьне Чырвонай арміі.

Бязьдзейнасьць—опортунізм на практыцы

У выкананьне настаноў ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ па месячніку праверкі беларусізацыі па Петрыкаўскаму раёну нічога не праводзіцца.

Да гэтага часу не праведзены сходы рабочых, служачых і бядняцка-серадняцкага сялянства па пытаньню месячніку беларусізацыі.

Пытаньне месячніку генэральнай праверкі яшчэ не стала у парадак дня партыйных, комсамольскіх і профэсыйных організацый раёну, масячнік не скарыстаны для яшчэ большай мобілізацыі рабочых і працоўных сялян на справу культурнага будаўніцтва і ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай політыкі, для ўдарнага вывучэньня беларускай мовы, гісторыі і экономікі Беларусі.

У Петрыкаўскім раёне знаходзіцца шмат працоўных нацменшасьцяй, але сярод іх не праводзіцца ніякай працы.

Члены КП(б)Б і ЛКСМБ яшчэ не правяраліся і не правяраюцца, як яны вывучаюць і ўжываюць ў штодзённым жыцьці белмову, як яны правільна разумеюць нацыянальнае пытаньне ленінскай партыі.

Выправіць адзначаныя тут недахопы неабходна зараз-жа. Гэта першачарговая задача, якая стаіць зараз перад партыйнымі, комсамольскімі і профэсыйнымі організацыямі Петрыкаўскага раёну.

Пост „ЧЗ“ Пінчук В.

Змагацца за ўжываньне белмовы

Ня гледзячы на своечасовыя дырэктывы ЛКСМБ аб абавязковым вывучэньні і ўжываньні беларускай мовы комсамольцамі, у політэхнікуме сувязі справа беларусізацыі абстаіць дрэнна.

У тэхнікуме меліся вылазкі вялікадзяржаўных шовіністых, шмат студэнтаў у тым ліку і комсамольцы недаацэньваюць беларусізацыю і ня ўжываюць белмову у штодзённым жыцьці.

Комсамольская ячэйка тэхнікуму не вядзе барацьбы за аўладаньне беларускай мовай, за вывучэньне гісторыі і экономікі Беларусі. Шмат комсамольцаў на сходах выступаюць выключна па расійску.

Бюро ячэйкі супроць зрыўшчыкаў беларусізацыі, ніякіх захадаў ня прымала ня гледзячы на тое, што насьценная газэта давала сыгналы аб дрэнным становішчы з беларусізацыяй.

Важнейшыя тэхнічныя дысцыпліны, як электратэхніка, тэхналёгія чарчэньне, тэлеграфія і г. д. выкладаюцца па расейску. Вытворчыя манэўры, якія праводзіліся ня далі зруху ў справе беларусізацыі.

З ўсёй рашучасьцю павінна весьціся барацьба з вялікадзяржаўным шовінізмам за правільную пастаноўку нацыянальнага пытаньня—вось што павінна памятаць кіраўніцтва ячэйкі і заўжды праводзіць у жыцьцё.

М.

Комунараўцы, вы не павінны адставаць

Месячнік беларусізацыі на заводзе „Комунар“ разгорнут дрэнна. Да чэрвеня месяца не было ніякага гуртка па вывучэньню белмовы. У чэрвені організаваўся адзін гурток, у які запісалася 12 чалавек, але гурток чамусьці не працуе.

Комсамольскі колектыў ня стаў актыўным удзельнікам па правядзеньні беларусізацыі на заводзе, не падумаў організаваць комсамолію заводу на вывучэньне гісторыі і экономікі Беларусі.

Неабходна разгарнуць працу па беларусізацыі на заводзе, каб да пленуму прысьці з рапартам конкрэтных дасягненьняў.

Варэнік

Бабруйская комсамолія ўключылася ў паход

Бабруйская комсамольская організацыя своечасова распачала падрыхтоўку да правядзеньня прызыву 1909 га году.

Вакол гэтае справы складзена адпаведная грамадзкая думка. Па ініцыятыве райвыканкаму і комсамолу разгорнута вялікая работа па выселеньню клясава-чужых і соцыяльна-небясьпечных элемэнтаў, для чаго па большасьці сельсаветаў створаны камісіі па клясаваму адбору і недапушчэньню гэтакіх у рады РСЧА. Камісія, створаная пры Гарсавеце ўжо правяла 4 пасяджэньні і выявіла 7 чалавек класава чужых.

У рабоце па выкрыцьцю гэтых асоб і складаньня характарыстык у большасьці прыцягнуты самі прызыўнікі і рабочая моладзь.

РК ЛКСМБ высылае брыгады ў сельсаветы і колгасы для праверкі ходу падрыхтоўкі да прызыву і ліквідацыі няпісьменнасьці сярод прызыўнікоў.

У горадзе ўжо выяўлена колькасьць няпісьменных і малапісьменных прызыўнікаў.

На прадпрыемствах створаны лікпункты для ліквідацыі іх няпісьменнасьці.

Для адзінак створана агульна-гарадзкая школа. У бліжэйшы час склікаецца сход усёй рабочай і працоўнае моладзі прызыву 1909 году на якім будзе стаяць пытаньне аб ліквідацыі няпісьменнасьці прызыўнікаў і аб значэньні прызыву.

У большасьці сваёй прызыўнікі ў раёне і горадзе прайшлі мэдагляд.

Работа па вызначэньню ільгот па гораду ўжо скончана. К 1-му ліпеня 1931 г. будзе закончана вызначэньне ільгот па сельсаветах.

Падрыхтоўка да прызыву зусім не асьвятляецца ў раённай газэце „Камуніст“.

Слабы ўдзел у правядзеньні гэтай кампаніі прымае таксама асоавіяхэмаўская організацыя.

Фельдман.

Настаўніцтва, прымай выклік

Заслаўскі РК комсамолу ўключыўся ў ажыцьцяўленьне пастановы ЦК ЛКСМБ аб пісьменным прызыве 1909 году.

Сіламі комсамолу зроблены вучот няпісьменных і малапісьменных прызыўнікаў.

На ліквідацыю няпісьменнасьці і малапісьменнасьці мобілізаваны ўсе настаўнікі-комсамольцы на час іх адпачынку, прыцягнута студэнтаў, хатнікі і іншы культсьветны актыў.

Комсамолец-настаўнік Мілюзенка абавязаўся ліквідаваць няпісьменнасьць і малапісьменнасьць усіх прызыўнікаў 1909 году за час свайго адпачынку і выклікае ўсіх настаўнікаў Заслаўскага раёну пасьледваць яго прыкладу.

Юнкор „ЧЗ“ Прыбытак Явка.



Ліквідуем няпісьменнасьць сярод прызыўнікоў

Каго і чаго чакаеце?

Ліквідацыя няпісьменнасьці сярод дапрызыўнікаў 1909 году па мястэчку Стрэшына да гэтага часу не праводзіцца.

Комсамольская ячэйка і ячэйка Асо-Авіяхэму, якія налічваюць у сваіх радох шмат сяброў нараджэньня 1909 году нічога не зрабілі па пытаньню ліквідацыі няпісьменнасьці сярод іх.

Дапрызыўнікі патрабуюць адказу ад ячэйкі комсамолу і Асо-Авіяхэму на такое пытаньне:

Займуцца яны пытаньнем ліквідацыі няпісьменнасьці сярод прызыўнікоў ці не?

Чакаем праз „Чырвоную Зьмену“ адказу.

Мажэянка.

Вы павінны выканаць узяты абавязак

6 месяцаў назад профком Менскага політэхнікуму сувязі ўзяў на сябе абавязак ліквідаваць няпісьменнасьць сярод 100 працоўных, але чамусьці гэта справа не праведзена ў жыцьцё. Студэнты нават ня прыступілі да практычнага выкананьне свайго рашэньня.

Ніякай працы па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дапрызыўнікаў не вядзецца.

Бюро комсамольскага колектыву трэба правяраць, як выконваюцца вынесеныя рашэньні.

Рыг. М.

ПА ТОЙ БОК МЯЖЫ

Забастоўка 30 тысяч шофэраў у Польшчы

ФАШЫЗМ УЗМАЦНЯЕ ТЭРОР

„На вуліцах не паявілася ні воднага таксі“

ВАРШАВА. 1. Сёньня пачалася забастоўка шофэроў таксі міжгародных аўтобусаў па ўсёй Польшчы. Па зьвестках газэт бастуюць звыш 30-ці тысяч чалавек. У Варшаве забастоўка праходзіць з выключнай салідарнасьцю. На вуліцах не паявілася ніводнага таксі. Некалькі таксі, якія не пажадалі ноччу зьвярнуцца к гаражу, былі бастуючымі перавернуты ўверх коламі.

Масавыя звальненьні рабочых і служачых

ВАРШАВА. 1. Учора ва ўсіх міністэрствах і дзяржаўных установах зволена каля 20 тысяч рабочых і служачых.

ВАРШАВА. 1. У сувязі з зачыненьнем „Віьдзеўскай мануфактуры“, у Лодзі звольнена 7 тысяч рабочых. Учора зачынілася таксама і жырардоўская тэкстыльная фабрыка у Жырардове, на якой у апошні час працавала паўтары тысячы рабочых.

Масавыя арышты

ВАРШАВА. Політычная поліцыя вытварыла ў Варшаве масавыя арышты рэволюцыйных рабочых, якія падазраваліся ў комуністычнай дзейнасьці і ўдзеле ў тэрорыстычных замахах. Арыштавана каля 100 чалавек.

Поліцыя выкрыла комуністычную друкарню

ВАРШАВА. Польскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што ў Сасноўцы (бліз Любліна) політычная поліцыя выкрыла комуністычную друкарню і значную колькасьць комуністычнай літаратуры.

Прокуратура патрабуе выдачы комдэпутата т. Рожэка

ВАРШАВА, 1. Як паведамляе „Астатне Вядомосьці“ прокуратура ў Сасноўцах патрабавала ад прэзыдыуму сойму выдачы суду комуністычнага дэпутата Рожэка.

Тав. Рожэк абвінавачваецца ў тым, што ён выступаў у Дамброўскім камення-вугольным басэйне „з анты-дзяржаўнай прамовай“. Такім чынам, з 3-х комуністычных дэпутатаў польскага сойму двое—Бужынскі і Рожэк—павінны быць выдадзены суду, а 3-ці Залескі—ляжыць цяжка хворым з прычыны пабояў, нанесеных яму у часе першамайскіх дэмонстрацый у Лодзі.

Дэмонстрацыя протэсту супроць прыгавору суду над 8 нэгрыцянскімі рабочымі

БЭРЛІН 2. У адзнаку протэсту супроць пакараньньня 8 маладых нэгрыцянскіх рабочых, якое рыхтуецца у ПАЗШ, учора перад будынкам консульства ПАЗШ у Бэрліне адбылася дэмонстрацыя рэволюцыйнай рабочай моладзі. Дэмонстранты выбілі каменьнямі вокны консульства. Выклікаваму атраду поліцыі удалося арыштаваць 4-х дэмонстрантаў.

Конкурс на лепшы рабочы літаратурны гурток і на лепшага кіраўніка гуртка

У мэтах выкананьня задач БелАПП на закліку рабочых ударнікаў у літаратуру, у мэтах замацаваньня работы рабочых літаратурных гурткоў на прадпрыемствах, умацаваньня пролетарскай літаратуры лепшымі прадстаўнікамі рабочае клясы, Менская асоцыяцыя пролетарскіх пісьменьнікаў абвяшчае конкурс на лепшы рабочы літаратурны гурток і лепшага кіраўніка гуртка.

Умовы конкурсу

Конкурс пачынаецца з 1 ліпеня і будзе працягвацца да 1 лістапада 1931 году. Вызначаецца дзьве прэміі: першая—навінкі пролетарскай літаратуры на сто рублёў гуртку, які пакажа лепшыя ўзоры сваёй працы, адзначыць гэрояў соцыялістычнага будаўніцтва праз выданьне кніжак ударнікаў, уцягне найбольшы лік рабочых ударнікаў у работу гуртка.

Другая прэмія месячная паездка на буйнейшае прадпрыемства БССР (па выбару) кіраўніка рабочага літаратурнага гуртка, гурток якога пакажа лепшыя якасныя паказальнікі ў справе ўцягненьня ў літаратуру лепшых рабочых-ударнікаў, гэрояў працы, у справе організацыі і выяўленьня творчасьці рабочых-ударнікаў, гурток якога зможа лепш організаваць творчасьць рабочых ударнікаў на службу выкананьня прамфінпляну, зьнішчэньня прарываў на заводзе, гурток якога прaробіць якасна лепшую работу ў напісаньні кніжкі пра соцспаборніцтва і ўдарніцтва на сваім заводзе.

Адказны сэкратар Менскай Асоцыяцыі Пролетарскіх Пісьменьнікаў

Андрэй Александровіч

Папраўка

Ва ўчарашнім № „ЧЗ“ на 2 стар., у артыкуле „Зусім нездавальняючы процант“ у другім абзацы надрукавана „організацыя вырасла на 90 чалавек“. Трэба чытаць: „Організацыя вырасла на 900 чалавек“

Друкарня імя тав. Сталіна.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Галоўлітбел № 599